**Бяляўская, Н.** Не на вайне, справімся / Н. Бяляўская // Сельская газета. – 2018. – 15 февр. – С. 9.

## НЕ НА ВАЙНЕ, СПРАВІМСЯ

*Выраз «гэта не на вайне» стаў статусным для былога воіна-інтэрнацыяналіста з Докшыц Іосіфа Ючкавіча. Праблемы, якія перыядычна ўзнікаюць, ім цяпер рашаюцца проста. Ён упэўнены: пакуль чалавек жьве, стаіць на нагах, мае здаровыя рукі і цвярозы розум, можна рашыць найскладанейшыя задачы. Ён не адкладвае на пасля тое, што можна зрабіць сёння, ніколі не паглядвае ўбок, как звярнуць з прамой дарогі.*



Тэрміновая служба вясковага хлопца пачалася з вучэбкі. Затым быў Афганістан у найбольш складаныя. – 1981—1983 — гады. Іосіф служыў у 108-й мотастралковай дывізіі ў медыцынска-санітарным батальёне. Санінструктар Ючкавіч мог аказаць практычна любую медыцынскую дапамогу, ведаў на лацінскай мове кожны прэпарат, падтрымліваў у параненых моц духу. За плячамі ўжо быў сельскагаспадарчытэхнікум, праца ў саўгасе, набыты жыццёвы вопыт. Аднак тое, з чьм давялося сустрэцца там, «за рэчкай», цяжка ўкладвалася ў галаве. Найбольш уразіла трагедыя на перавале Саланг.

Амаль пад воблакамі, на вышыні каля чатырох кіламетраў, замест вузкай горнай дарогі быў пабудаваны тунэль, праз які праходзіла шасціметровая магістраль. Рух аўтамабіляў ажыццяўляўся двухбакова. Тунэль лічыўся стратэгічна важньм аб'ектам і знаходзіўся пад аховай. Але як *яго* ні ахоўвалі, аднойчы здарылася непрадказальнае: без адзінага выстралу там загінула 70 савецкіх ваеннаслужачых і больш за сто маджахедаў. Аб прычынах здарэння гаварылі, ды і цяпер гавораць, па-рознаму. Галоўным жа для юнака стала смерць, якая забрала многія жыцці і пакалечыла лёсы.

Да гэтага часу ў яго вачах стаяць тыя цынкавыя дамавіны, што заносілі яны ў самалёт. Першыя гады пасля службы Іосіфу практычна не спалася. Заплюшчваў вочы – і зноў бачыў таварышаў па службе. Кароткія сны чамусьці заканчваліся выявай дарогі. Іосіфу вельмі хацелася ведаць, куды яна яго кліча і што чакае там, за паваротам.

Цяпер Іосіф Іванавіч разумее, што сны прадказвалі шчаслівую будучыню. Амаль адразу пасля дэмабілізацыі хлопца запрасілі на вяселле, і там сярод мноства дзяўчат яму кінулася ў вочы гарэзлівая Аленка. Сур'ёзнаму хлопцу па душы прыйшлася весялушка, і ён сказаў яе маці: «Вазьму ў жонкі тваю дачку». Як ужо вядома, як сказаў Ючкавіч, так і зрабіў. Канечне, да таго былі сустрэчы ў дарозе.

Яна прыязджала з Вілейкі, ён «ляцеў» да яе з Докшыц. Ажаніліся – і зноў была дарога. Дарэчы, зімой – лыжная. Маладыя людзі такім ходам навяшчалі бацькоў. Сярод іншага Іосіф працягваў вучыцца. Прафесію

заатэхніка памяняў на майстра дарожнай справы. З той пары прайшло нямала часу, У сям'і нарадзіліся і выраслі двое дзетак. Іосіф Іванавіч ужо дзядуля, а ў душы па-ранейшаму юнак з апаленым лёсам, вельмі патрабавальны да сябе і падначаленых майстар дарожна-рамонтнага ўпраўлення № 180.

Яго ўчастак – 243 кіламетры дарог рэспубліканскага і раённага значэння. Асабліва заснежыла зіма ў лютым, а таму майстру са сваёй брыгадай даводзіцца працаваць нават ноччу.

– Усё як звычайна, – усміхаецца Іосіф Ючкавіч. – Не на вайне, справімся.

*Нэлі* ***БЯЛЯЎСКАЯ****, фота Вячаслава* ***ЧАРВІНСКАГА***